Палажэнне

аб раённым конкурсе электронных паўнатэкставых дакументаў «Вялікая Айчынная вайна ў гісторыі маёй вёскі і лёсах маіх землякоў»

1.Мэты і задачы

-актыўнае выкарыстанне камп'ютарных тэхналогій у практычнай дзейнасці бібліятэк;

-стварэнне ўласнага электроннага паўнатэкставага краязнаўчага бібліятэчнага прадукту;

-развіццё і падтрымка творчага патэнцыялу супрацоўнікаў бібліятэк, павышэнне іх прафесійнага майстэрства;

-абмен вопытам работы бібліятэк па выкарыстанні інфармацыйных тэхналогій;

-фарміраванне цікавасці да вывучэння гістарычнай літаратуры, збору, апрацоўкі і афармленню матэрыялаў аб Вялікай Айчыннай вайне.

2.Парадак і ўмовы правядзення

Конкурс праводзіцца з 1 лютага па 1 лістапада 2015 года.

У конкурсе прымаюць удзел усе камп'ютарызаваныя бібліятэкі ЦБС.

На конкурс прымаюцца паўнатэкставыя электронныя дакументы ваеннай тэматыкі, прысвечаныя гісторыі вёсак і лесам землякоў.

Паўнатэкставыя дакументы прадастаўляюцца на электронных носьбітах у аддзел бібліятэчнага маркетынгу да 15 кастрычніка 2015 г.

3.Крытэрыі конкурснага адбору

-Суадноснасць зместу дакументаў з тэмай конкурсу;

-Высокі ўзровень раскрыцця і стылёвае аддзінства зместу;

-Арыгінальнасць афармлення электронных дакументаў;

-Дакладнасць і паўната асвятлення краязнаўчга матэрыялу ваеннай тэматыкі

-Выкарыстоўванне ў рабоце матэрыялаў з самых разнастайных крыніц.

4.Падвядзенне вынікаў конкурсу

Вынікі конкурсу будуць падведзены не пазней 10 лістапада 2015 года

Пераможцы конкурсу будут узнагароджаы грашовымі прэміямі з унебюджэтнага фонду ЦБС.

Склад журы конкурсу:

1.Іванова М.В. – дырэктар ЦБС

2.Галавейка Т.А. – заг.аддзела бібліятэчнага маркетынгу ЦБ

3.Курачук С.Д. – гал.бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі ЦБ

4.Мілашук Т.І. – гал.бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу ЦБ

5.Легацюк Л.В. – старшыня прафсаюза бібліятэчных супрацоўнікаў ЦБС

Кантактная інфармацыя:

аддзел бібліятэчнага маркетынгу

2-36-81

Сайт: www.krcls.by E-mail: Kobrinlib@gmail.com